06.09.2008 - №1

Суд Цэнтральнага раёну горада Менску,
Вул. Багдановіча, 10
Менск.

**Заяўнікі:**

1) Лапіцкі Аляксей (Іванавіч),
вул. 50 год Кастрычніку 8А-30,
220160, г.Жодзіна, Менскай вобласьці;
(прэтынэнт у склад АВК №66, кандыдатура якога з парушэньнем ВК РБ нават не разглядалася на паседжаньні Менаблвыканкаму …);

2) Лапіцкая Сьвятлана (Пятроўна),
Пр. Ф.Скарыны 3-115, 220160, г.Жодзіна, Менскай вобласьці;
(прэтындэнтка на выбарах у ПП НС РБ 4-га скліканьня ад ПБНФ, вымушана была адмовіцца ад рэгістрацыі ініцыятыўнае групы з прычыны відавочных парушэньняў ВК РБ ужо на пачатковым этапе.)

**Зацікаўленыя асобы:**

1) Адміністрацыя Менскага Аблвыканкаму
(старшыня Мінаблвыканкаму. Крупец Л.Ф.,
Начальнік Галоўнага упраўленьня арганізацыйна-кадравай працы Менаблвыканкаму, Амельянчук М.М. …) і
2) Прэзыдыюм Менскага Аблсавету дэпутатаў
(старшыня Менскага абласнога Савету дэпутатаў, Герасімовіч С.М. …),
Вул. Энгельсу, 4, 220030Менск

Па факце неправамерных дзеяньняў (падтасоўкі фактаў і маніпуляцыі дакумэнтамі выбарчага зьместу, парушэньня законнай працэдуры пры фармаваньні складу Жодзінскай АВК №66), якія прывялі да парушэньня правоў грамадзянаў-выбарнікаў, прэтындэнта ў АВК №66, Аляксея Лапцікага, і прэтындэнткі на выбарах у дэпутаты ПП НС РБ, Сьвятланы Лапіцкай:

- калектыўная заява (ад 108 выбарнікаў, жыхароў г.Жодзіна) аб вылучэньні кандыдатуры А.Лапіцкага ў склад Жодзінскай АВК №66, своечасова скіраваная й дастаўленая на разгляд, на паседжаньні Менаблвыканкаму і Прэзыдыюму адпаведнага Савета дэпутатаў 14.07.2008г. у парушэньне ВК РБ – не разглядалася, таму й
- кандыдатура не магла быць зацьверджанай, а ў выніку
- рашэньне Менаблвыканкаму і Прэзыдыюму Менскага абласнога Савету дэпутатаў па фармаваньні АВК №66 у Жодзіне было вынесена з парушэньнем выбарчае працэдуры, таму зьяўляецца неправамерным.

# СКАРГА

я, Аляксей Лапіцкі, як грамадзянін Беларусі, прэтындэнт ад групы грамадзянаў (108 жыхароў горада Жодзіна) у Жодзінскую Акруговую выбарчую камісыю №66, адзначаю, што дзеяньнямі адказных асобаў Менаблвыканкаму і Прэзыдыюму Менскага Аблсавету мае правы й правы дадзенай групы грамадзянаў (што мяне вылучала) былі парушаныя.

Мая кандыдатура – не разглядалася на адпаведным арганізацыйным супольным паседжаньні Менскага аблвыканкаму й Прэзыдыюму Менаблсавету дэпутатаў 14 ліпеня 2008 года, на якім праводзілася працэдура па зацьверджаньні складу акруговых камісыяў, у тым ліку й Жодзінскай АВК №66, у склад якой у поўнай адпаведнасьці з ВК РБ грамадзянамі РБ, што пражываюць у Жодзіне, скіроўвалася мая кандыдатура.

Дадзеная калектыўная заява з подпісамі 108 грамадзянаў своечасова, 07.07.2008г. была адпраўлена мною непасрэдна ў адзначаныя вышэй органы, што фармавалі склад АВК па Менскай вобласьці, замоўным паштовым адпраўленьнем з адпаведным апавяшчэньнем аб дастаўцы. Гэты дакумэнт быў дастаўлены па прызначэньні 09.07.2008г., а адваротнае пацьверджаньне аб дастаўцы скіраванае абратна поштаю мне як заяўніку ўжо 11.08.2008г. (гл. копію дакумэнта ў дадатаку №2).

Акрамя гэтага, мяне не дапусьцілі прысутнічаць на дадзеным паседжаньні, матывуючы гэта спэцыяльным калегіяльным рашэньнем супольнага воргану на паседжаньні 14.07.2008г.,

нягледзячы на тое, што я спэцыяльна прыехаў для гэтага з Жодзіна пасьля ўзгадненьня гэтага пытаньня за 2 дні да паседжаньня з Амельянчуком М.М. па тэлефоне.

На мой пратэст аб парушэньні дэмакратычнай працэдуры ўчасе правядзеньня паседжаньня Менаблвыканкаму 14.07.2008г. па вызначэньні складу Жодзінскай АВК №66 я атрымаў адказ за №302-740 ад 06.08.2008г. ад начальніка Галоўнага арганізацыйна-кадравага ўпраўленьня гэтае дзяржаўнае ўстановы выканаўчае ўлады, Амельянчука М.М. У ім адзначаецца, што мая заява быццам была дасланая ў Менаблвыканкам 12.07.2008г., то бок, пазьней за ўстаноўлены ВК РБ тэрмін (11.07.2008г.). Менавіта з-за гэтага яна, нават, не разглядалася на адзначаным паседжаньні 14.07.2008г.

Трэба заўважыць, што адказ Амельянчука М.М. ад 06.08.2008г. без праблемаў дастаўлены ў Жодзіна й трапіў заяўніку ўжо 07.08.2008г. – напрацягу 1 календарных сутак (!?).

Лічу, што гэта лішні раз даказвае надуманасьць той матывацыі, якую абралі для сябе ў Менску, каб неяк апраўдаць факт парушэньня законнае працэдуры. Для гэтага, як бачна, абраны шлях прымітыўнай падтасоўкі фактаў з усімі прыкметамі маніпуляцыі дакумэнтамі выбарчага зьместу (калі ўспрымаць сур’ёзна дадзеныя М.М. Амельянчуком тлумачэньні – мой ліст, які быў адпраўлены 07.07.200г., дайшоў да адрэсату ў Менску толькі 12.07.2008г. – аж праз 5 календарных сутак!?)

Так, у выніку дадзеных, відавочна неправамерных дзеяньняў – была груба парушана працэдура пры фармаваньні дзейснага складу АВК №66 у Жодзіне. Таму, дадзены склад Жодзінскай АВК №66 нельга лічыць правамерным.

Дадзеная матывацыя майго недалучэньня да складу Жодзінскай АВК №66 разглядаецца намі, як няўдалая спроба мэтанакіравай падтасоўкі фактаў і маніпуляцыі дакумэнтамі выбарчага зьместу ўчасе фармаваньня Жодзінскай АВК№66 для таго, каб апраўдаць адпаведныя неправамерныя дзеяньні, у выінку якіх мая кандыдатура не была вынесена на разгляд адпаведнага паседжаньня ў Менаблвыканкаме, па ёй зусім не прымалася належнага рашэньня і я, такім чынам, не тапіў у скалад Жодзінскай акруговай камісыі №66.

У сувязі з гэтым, намі канстатуецца наяўнасьць шэрагу грубейшых парушэньняў палажэньняў ВК РБ і дзейснага заканадаўства краіны з боку адказных службовых асобаў выканаўчае ўлады, у выніку чаго парушаныя правы грамадзянаў-выбарнікаў (108 заяўнікоў), нашыя асабістыя і грамадзянска-палітычныя правы – правы прэтындэнта ў склад АВК №66, Аляксея Лапіцкага, і прэтындэнткі на выбарах у дэпутаты ПП НС РБ чацьвёртага скліканьня, Сьвятланы Лапіцкай (ПБНФ, г.Жодзіна), якая разглядала вынікі адзначанага вышэй паседжаньня Менаблвыканкаму 14.07.2008г. у дачыненьні да маёй кандыдатуры, як вызначальны фактар пры вырашэньні пытаньня аб сваім удзеле-няўдзеле ў выбарчай кампраніі 2008г.

Бо ўваход у склад АВК прынцыповай і незалежнай, здольнай уплываць на ход абмеркаваньня і прыняцьця рашэньня асобы, мог бы быць сыгналам аб рэальным рашэньні ўладаў праводзіць дэмакратызацыю існуючай, цалкам зарэгуляванай і незбалансаванай, закрытай сыстэмы падпарадкаваных “вэртыкалі” выбарчых структураў (камісыяў, групаў, штабоў…), якая не дазваляе казаць пра магчымасьць свабоднага й дэмакратычнага выбару ў Беларусі на дадзеным канкрэтным этапе і ў дадзеных канкрэтных умовах.

Такім чынам, адзначаныя мною парушэньні грамадзянскіх і выбарчых правоў сталі вынікам неправамерных дзеяньняў чыноўнікаў, адказных за арганізацыю і правядзеньне выбарчае кампаніі ў Менскай вобласьці, якія альбо санкцыявалі злачынствы, альбо самі сталі непасрэднымі выканаўцамі злачыннага загаду й дапусьцілі відавочныя правапарушэньні ВК РБ і міжнародных стандартаў права з мэтаю недапушчэньня незалежнага прадстаўніка да працы ў Жодзінскай АВК №66 на выбарах у ПП НС РБ 2008 года.

*Абскарджваемае рашэньне дзейсных органаў улады адносіцца да ненарматыўнага праўнага акту. Адпаведна ч.4., арт. 122 Канстытуцыі РБ “рашэньне мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распараджальных органаў, якія абмяжоўваюць альбо парушаюць законныя правы грамадзянаў, а таксама ў іншых прадугледжаных заканадаўствам выпадках могуць быць абскарджанымі ў судовым парадку”, што адпавядае правілам з арт. 12 ГК РБ – “ненарматыўны акт дзяржаўнага органу альбо органу мясцовага кіраваньня й самакіраваньня, а таксама акт заканадаўства, не адпавядаючы іншаму заканадаўчаму акту і парушаючы грамадзянскія правы і ахоўваемыя заканадаўчымі актамі інтарэсы грамадзяніна і*

*(ці) юрыдычнай асобы, прызнаецца судом несапраўдным па запатрабаваньні асобы, чые правы парушаныя, а ў выпадках прадугледжаных заканадаўствам, - па запатрабаваньні іншых асобаў. У выпадку прызнаньня судом акту несапраўдным парушанае права падлягае ўзнаўленьню ці абароне іншымі спосабамі, прадугледжанымі артыкулам 11 ГК".*

Адзін з спосабаў абароны грамадзянскіх правоў, пазначаных у законе, зьдзяйсьняецца шляхам прызнаньня несапраўдным акту дзяржаўнага ворагану ці воргану мясцовага кіраваньня і самакіраваньня (п.5, арт. 11 ГК). Права на судовую абарону гарантуецца арт. 60 Канстытуцыі РБ, арт.10 ГК РБ, арт. 6, п.5 арт.335, арт.арт. 353-358 ГПК РБ. Акрамя таго, судовы парадак абскарджваньня рашэньняў мясцовых адміністрацыяў, абмяжоўваючых ці парушаючых правы, свабоды й законныя інтарэсы грамадзянаў прадугледжаны ч.3, арт 49 Закону "Аб мясцовым кіраваньні й самакіраваньні ў Рэспубліцы Беларусь".

Закон забараняе адмову ў судовай абароне з матываў адсутнасьці, непаўнаты, супярэчлівасьці, незразумеласьці нарматыўнага акту (ч.4, арт.6 ГПК).

Прымаючы да ўвагі, таксама, што нормамі ВК РБ не прадугледжваецца іншы парадак абскарджваньня рашэньняў мясцовых адміністрацыяў па фармаваньні АВК, абскарджваньне праводзіцца ў агульным парадку, што ўстанаўліваецца вышэй згаданымі законамі.

А арт. 137 Канстытуцыі РБ адназначна прадпісвае імпэратыўнасьць нормаў Канстытуцыі – безумоўны прыярытэт і дзейнасьць гэтых нормаў у выпадку наяўнасьці разыходжаньняў з нормамі ўсіх іншых законаў, дэкрэтаў альбо ўказаў ...

ТАМУ, відавочна, што нашая спрэчка мусіць разглядацца судамі агульнай юрысдыкцыі й, акрамя таго, закранаючы выбарчыя правы грамадзянаў, заяўнікоў па скарзе, дадзены зыск не падлягае аплаце дзяржпошліны.

**У сувязі з выкладзеным, кіруючыся** арт.335, арт. арт. 353-358 ГПК РБ, **ПРОСІМ:**

1) прызнаць абскарджваемыя дзеяньні Адміністрацыяў, Менскага абласнога выканкаму й Прэзыдыюму Менскага абласнога Савету дэпутатаў, па пытаньні прыняцьця рашэньня ад 14.07.2008г. аб фармаваньні Акруговых выбарчых камісыяў на выбарах дэпутатаў палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацьвёртага склікаьня – дыскрымінацыйнымі ў дачыненьні да заяўнікоў і падпісантаў неразгледжанай на адпаведным паседжаньні заявы з 108 подпісамі грамадзянаў (абмежаваньні і ўціск правоў грамадзянаў з мэтаю недапушчэньня ў склад АВК)…, а само рашэньне – непраавамерным;

2) абавязаць зацікаўленых асобаў – Адміністрацыі Менскага абласнога выканкаму й Прэзыдыюму Менскага абласнога Савету дэпутатаў прыняць новае рашэньне аб фармаваньні Жодзінскай АВК№66 з далучэньнем да складу АВК №66 кандыдатуры Аляксея Лапіцкага, праваабаронцы й сябра Сойму ПБНФ з Жодзіна;

3) у парадку дасудовае падрыхтоўцы абавязаць да дня разгляду скаргі прадставіць рашэньне аб фармаваньні АВК ад 14.07.2008г. і адпаведныя матэрыялы, датычныя разглядаемага пытаньня, дакумэнтаваныя пацьверджаньні фактаў, выкладаемых у адказах на даручэньні Пракуратуры Менскай вобласьці, скіраваныя старшыням Менаблвыканкаму й Менаблсавету, адпаведна Крупцу Л.Ф. й Герасімовічу С.М., з прапановамі разгляду пытаньня аб далучэньні А.Лапіцкага ў склад Жодзінскай АВК №66, а таксама матэрыялы службовых дасьледваньняў і копіі афіцыяных адказаў з дадзеных установаў улады ў бок заяўнікоў …;

4) прыняць захады па максымальна апэратыўным і хуткім судовым дасьледваньні справы, каб без безпадстаўнага прамаруджваньня часу прыняць належнае рашэньне аб узнаўленьні парушаных правоў пацярпелых ад непраавамерных дзеяньняў чыноўнікаў.

**У дадатках на _________стар.:**

1) Копіі адказаў начальніка Галоўнага ўпраўленьня арганізацыйна-кадравай працы Менаблвыканкаму Амельянчука М.М. і дакумэнту аб своечасовым атрыманьні дадзенага адпраўленьня ў Менаблвыканкаме з наступным апавяшчэньнем заяўніка.
2) Адказ за № 0700/63-2008 в.а. пракурора Менскай вобласьці М.І. Пілінкевіча ад 22.08.2008г.;
3) Адказ за № 1-13/18 ад 03.09.2008г. старшыні Менскага абласнога Савету дэпутатаў.

**_______________________Аляксей Лапіцкі,**

**___________________Сьвятлана Лапіцкая**